Г. В. Штыхаў даследаваў 6 курганоў.

Курган 1 амаль круглы, вышынёй 1,85 м, дыяметрам 11,5 м. Пад курганом вугальная праслойка, на якой 2 трупапалажэнні.

Курган 2 круглы, вышынёй 1,8 м, дыяметрам 8 м. У ПдЗ частцы насыпу выяўлены касцяк даўжынёй 1,74 м. Інвентар адсутнічае. Старажытны гарызонт уяўляў сабой гумусавую чорную глебу 5—17 см. На ёй пахаванне 2, арыентаванае таксама, як першы касцяк. Знойдзена шыфернае прасліца і кавалкі гаршкоў.

Курган 3 авальны ў плане, 9×6,9 м, вышынёй 1,85 м. Вышэй мацерыка знойдзены частка чэрапа і зуб чалавека, непадалёку — металічны крыжык і 15 пацерак. Пацеркі шкляныя залачоныя, адна сіняя чатырохгранная і плоская пацерка з сіняга празрыстага шкла.

Курган 4 круглы, дыяметрам да 7 м, вышынёй 0,9 м. Блізка да цэнтра ляжалі 2 касцякі, напэўна, жанчыны і дзяўчынкі. З двух бакоў галавы дарослай жанчыны знойдзены пацеркі, з правага боку чэрапа 5 скроневых кольцаў і сярэбраная манета, якая служыла падвескай, з левага боку — чатыры кольцы. На пальцы правай рукі — бронзавы пярсцёнак, каля пояса злева фрагмент жалезнага сярпа, 64 пацеркі шкляныя залачоныя, малыя па памерах, адна рабрыстая залачоная пацерка, 6 пацерак бурштынавых цёмна-аранжавых, па форме круглых. Скроневыя кольцы зроблены з круглага дроту: 6 кольцаў з зыходзячымі канцамі, 2 са свабоднымі патончанымі. Адно эсаканечнае кальцо даволі рэдкае для тэрыторыі Паўночнай Беларусі. У пахаванні быў дынарый дыяметрам 2 см, з адтулінай для прымацавання вушка. Манета Этэльрэда II (979—1016 гг.), чаканеная ў Англіі. На тыльным яе баку выява «доўгага крыжа». Час абарачэння такіх манет 997—1003 гг. Касцяк пахавання 1 быў пашкоджаны пры другім, больш познім (упускным) пахаванні. Час, які аддзяляў другое пахаванне ад першага, напэўна, непрацяглы. Даўжыня другога касцяка 1,45 м. Каля грудзей знаходзілася дзіцячая чэлюсць і ракавіна ўлiткі.

Курган 5 круглы, дыяметрам 5,2 м, вышынёй 0,75 м. Курган пусты.

Курган 6 круглы ў плане. Дыяметр 6 м, вышыня 1,55 м. Пахаванне не знойдзена.

Час утварэння трэцяй курганнай групы каля в. Слабодка вызначаецца XI ст., таксама як і другой групы. Абедзве курганныя групы ўзніклі некалькі пазней першага курганнага могільніка, у якім ёсць трупаспаленне. Ён функцыяніраваў да пачатку XI ст.

*Старыя Лаўкі.* На Пд ускраіне в. Старыя Лаўкі маецца курган вышынёй 1,3 м, дыяметр 6 м.

*Стаўбцы.* За 2,3 км на ПдУ ад в. Стаўбцы, у лесе, ва ўрочышчы Валатоўкі размешчаны курганны могільнік з 45 курганоў вышынёй 0,6—2 м, дыяметрам 3—10 м. Раскопкі не праводзіліся.

*Труханавічы.* Ля в. Труханавічы за 0,7 км на Пн, на тэрыторыі рамонтных майстэрняў калгаса «Прагрэс» курганны могільнік з 15 курганоў вышынёй 2—3 м, дыяметрам 10—12 м. Мясцовая назва Валатоўкі. Раскопкі не праводзіліся.

*Трылесіна.* Ля в. Трылесіна на Пд ускраіне яе, ва ўрочышчы Валатоўкі (правы бераг р. Ула) курганны могільнік з 35 курганоў. Раскопкі не праводзіліся.

**Каменныя крыжы.** На тэрыторыі раёна знойдзена 26 каменных крыжоў. Найбольш вялікіх памераў крыжы ля в. Малая Вядрэнь. Найбольшая колькасць каменных крыжоў знойдзена на могілках, справа ад дарогі ў в. Кажары. Тут 18 крыжоў памерамі: вышыня 0,7—1,5 м, шырыня 0,6—0,9 м, таўшчыня 0,15—0,25 м. Адносяцца да XIII—XVI стст. На асобных крыжах — надпісы на стараславянскай мове. Побач вялікая колькасць каменных пліт, высечаных з мясцовага шэрага граніту.

Археалагічныя раскопкі, даследаванне знойдзеных прадметаў даюць магчы-